# РАДУЮСЯ Я — ГЭТА МАЯ ПРАЦА



## ТАВАРЫШЫ СТУДЭНТЫ!

У гэтым годзе наша краіна будзе адзначаць знамянальную дату — 50-годдзе ўтварэння СССР. Гэта накладае на студэнцтва вялікую адказнасць.

Перад савецкімі студэнтамі стаіць грандыёзная па сваёй важнасці задача — з гонарам прадаўжаць вялікую справу камунізму, пачатую бацькамі.

56 атрадаў Гомельшчыны агульнай колькасцю 1800 чалавек будуць працаваць ва ўсіх раёнах вобласці.

Падтрымліваючы ініцыятыву Мінскага і Віцебскага абласных студэнцкіх будаўнічых атрадаў, мы заклікаем усіх байцоў у год 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік паказаць узоры самаадданай камуністычнай працы, актыўнай грамадскай работы.

Абласны штаб СБА.

## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК ДЛЯ БАЙЦОЎ СБА

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗЛЁТ

Кожны год, у пачатку жніўня, на граніцы трох абласцей — Бранскай, Гомельскай і Чарнігаўскай — з'язджаюцца хлопцы і дзяўчаты ў форме байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Гэта студэнты трох братніх рэспублік збіраюцца на свой традыцыйны злёт. З ініцыятывай аб правядзенні злёту выступіў у 1969 годзе Гомельскі абласны штаб. І вось ужо поўным ходам ідзе падрыхтоўка да IV Інтэрнацыянальнага злёту, які прысвечан 50-годдзю ўтварэння СССР.

Дэлегатамі злёту з'яўляюцца лепшыя атрады — пераможцы сацспаборніцтва па выніках падрыхтоўчага перыяду і першага месяца трэцяга працоўнага семестра.

Кожны злёт пакідае незабыўнае ўражанне, таму што кожны злёт — гэта вялікае свята студэнцтва. Урачыста і красачна праходзіць гэта студэнцкае свята. Выступленне агітбрыгады, працоўны дэсант на палі калгасаў і саўгасаў, спартыўныя гульні і спаборніцтвы — дні свята запоўнены цалкам. А па вечарах ля кастра гучаць задушэўныя народныя і вясёлыя студэнцкія песні.

Карацей кажучы — лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. І гэта, рабяты, ў вашых руках. Кожны з вас можа стаць удзельнікам злёту, трэба толькі захацець.

**Я. ТРАШЧАНКОЎ,**
**удзельнік I, II і III Інтэрнацыянальных злётаў.**

## РАЎНЕННЕ — НА КАМСАМОЛ ДВАЦЦАТЫХ ГАДОЎ

У 1919 годзе па ініцыятыве Уладзіміра Ільіча Леніна быў праведзен першы Ўсерасійскі камуністычны суботнік, які паклаў пачатак камуністычным адносінам да працы і стаў добрай традыцыяй працоўных нашай Радзімы.

Вялікі ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі ў перыяд грамадзянскай вайны і наследуючыя гады прымалі камсамольцы 20-х гадоў. У нерабочы час камсамольцы і моладзь чыгуначнага транспарту рабілі расчыстку пуцей, аднаўленне паравозаў і вагонаў, аказвалі дапамогу сялу ў рамонце інвентару збіралі металалом.

Усе сродкі за праведзеныя работы пералічваліся дзяржаве на аднаўленне народнай гаспадаркі краіны.

Так, напрыклад, камсамольцы і моладзь Гомельскага паравознага дэпо адрэмантавалі ў нерабочы час паравоз серыі ОВ № 1060 у падарунак XI Губернскай канферэнцыі РКП(б). На ПВРЗ быў адноўлен паравоз у падарунак VII Губернскаму з'езду РКСМБ, а камсамольцы вагоннага дэпо зрабілі капітальны рамонт вагона ў падарунак XVII з'езду ВКП(б).

Актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні суботнікаў 20-х гадоў камсамольцы А. Н. Конаш, С. П. Малчанаў, А. Н. Несціровіч, М. Н. Сімкоўскі, Г. Я. Гаўрыленка, К. Т. Турык, А. М. Глушакоў, А. Нікіцін, Е. І. Елкін, П. А. Грыгор'еў і многія, многія іншыя.

Следуючы традыцыям старэйшага пакалення Ленінскі камсамол 30—70-х гадоў унёс вялікі ўклад у асваенне цаліны, у выкананне пяцігодак і зараз актыўна ўдзельнічае ў аказанні дапамогі калгасам, у будаўніцтве новых школ, заводаў і іншых будоўляў. Прадаўжальнікамі гэтых традыцый сталі студэнты — байцы будаўнічых атрадаў.

Толькі ў гэтым годзе ў працоўным семестры прыме ўдзел каля дзвюх тысяч студэнтаў Гомельшчыны.

Дарагія таварышы! Жадаем Вам, ад'язджаючым на будоўлі краіны, вялікіх поспехаў у працоўным семестры. Шчаслівага Вам шляху!

**А. Н. КОНАШ,**
**С. П. МАЛЧАНАЎ,**
**камсамольцы 20-х гадоў.**

«... СТУДЭНЦКІЯ БУДАЎНІЧЫЯ АТРАДЫ. ГЭТА — ТАКАЯ ФОРМА ВЫЯЎЛЕННЯ І МАБІЛІЗАЦЫІ ЭНЕРГІІ СТУДЭНЦТВА, ЯГО АКТЫЎНАСЦІ, ЯКАЯ ЦАЛКАМ АДПАВЯДАЕ І ПАТРЭБНАСЦЯМ НАШАГА ЧАСУ, І ЗАПАТРАБАВАННЯМ МОЛАДЗІ».

**Л. І. БРЭЖНЕЎ.**
(З прамовы на Усесаюзным злёце студэнтаў).

## СБА — 50-годдзю ўтварэння СССР

Штогод — вось ужо на працягу пяці гадоў — ардэнаносная Гомельшчына становіцца летам самай вялікай студэнцкай аўдыторыяй. На час трэцяга працоўнага семестра сотні студэнтаў і навучэнцаў тэхнікумаў запаўняюць гэту аўдыторыю — будучыя чыгуначнікі і педагогі, медыкі і будаўнікі становяцца мулярамі і цеслярамі, сувязістамі і меліяратарамі.

За пяць гадоў многае зроблена рукамі студэнтаў на тэрыторыі вобласці — пабудаваны новыя школы, жылыя дамы і вытворчыя памяшканні. Сотні канцэртаў дадзены агітбрыгадамі СБА. Тысячы людзей праслухалі лекцыі, прачытаныя студэнтамі. Многія хлопчыкі і дзяўчынкі адпачылі ў піянерскіх лагерах «Спадарожнік», што працуюць пры СБА.

Спартыўныя спаборніцтвы, дапамога калгасам і саўгасам, «Бюро добрых паслуг» і кансультацыйныя пункты для паступаючых у ВНУ — гэта далёка няпоўны пералік грамадскай работы байцоў будаўнічых атрадаў.

Партыя і ўрад высока ацанілі работу студэнтаў у трэцім семестры. Байцы будаўнічых атрадаў Гомельшчыны ўзнагароджаны Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ. А студэнты Я. Трашчанкоў (БІІЧТ) і В. Касюк (ГДУ) удастоены медалей «За працоўную адзнаку».

Студэнты Гомельшчыны разам з усімі працаўнікамі вобласці рыхтуюцца да святкавання 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Падтрымліваючы ініцыятыву студэнтаў Мінска і Віцебска, свае працоўныя справы яны прысвячаюць гэтаму знамянальнаму юбілею.

Яшчэ адзін юбілей будуць адзначаць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў нашай рэспублікі — СБА Беларусі спаўняецца ў гэтым годзе дзесяць гадоў.

У будучым семестры абласны атрад колькасцю звыш 1600 чалавек асвоіць на разнастайных будоўлях каля двух мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Два атрады з Гомельскага дзяржуніверсітэта і адзін атрад з Мазырскага педінстытута будуць працаваць на будоўлях Казахстана, адзін атрад з ГДУ — на будоўлі ў Томскай вобласці. Тры атрады накіроўваюцца на Рэспубліканскую ўдарную камсамольскую будоўлю ў Акцябрскі раён.

На ўдарную камсамольскую будоўлю рэспублікі «Мазырнафтахімбуд» ад'язджаюць тры атрады з ВНУ вобласці, у тым ліку атрад з падрыхтоўчага аддзялення Гомельскага дзяржуніверсітэта. Больш чым 260 тысяч рублёў капіталаўкладанняў асвоіць атрад у саставе 200 чалавек на Усесаюзнай камсамольскай ударнай будоўлі «Галоўпалессеводбуд».

Асаблівая ўвага студэнцкімі будаўнічымі атрадамі будзе ўдзяляцца развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, будаўніцтву жылля і культурна-бытавых аб'ектаў. Прадметам асаблівых клопатаў стане ўзвядзенне новых жывёлагадоўчых комплексаў. На сельскім будаўніцтве будзе занята 28 атрадаў.

Працуючы бок аб бок з рабочымі і працаўнікамі сяла, байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў выхоўваюцца ў духу камуністычнай ідэйнасці, адданасці нашай Савецкай Радзіме, непарушнай дружбы народаў, сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. Шматлікія мерапрыемствы — фестывалі, мітынгі, лекцыі, канцэрты, якія пройдуць у атрадах у гонар 50-годдзя ўтварэння СССР, — паслужаць далейшаму ўмацаванню слаўных інтэрнацыянальных традыцый Ленінскага камсамола.

**В. ТУКАЙ,**
**сакратар Гомельскага АК ЛКСМ Беларусі.**



На здымку: СБА Мазырскага педінстытута перад ад'ездам на будоўлю.

## МЫ БЫЛІ ПЕРШЫМІ

1963-ы — памятны год для студэнтаў Гомельскага педінстытута. Роўна дзесяць гадоў назад першы студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю ў 196 чалавек адправіўся на будаўнічыя пляцоўкі Казахстана. Гэта былі першапраходцы. А першым зацёды цяжка. Не хапала будматэрыялаў, адсутнічаў вопыт. Але нягледзячы на гэтыя цяжкасці, нягледзячы на тое, што ніхто не верыў, што будучыя педагогі могуць стаць сапраўднымі будаўнікамі, першыя дні работы ўсё паставіла на сваё месца. Нават ў спякотныя дні, калі нясцерпна паліла сонца, калі не было відаць на рабоце мясцовых жыхароў, нашы хлопцы не здаваліся. Аб'ём работ па дагавору быў асвоен хутка, і кіраўнікам бударганізацый давялося шукаць для нас новыя аб'екты.

А ўвечары, у рэдкія гадзіны адпачынку, хлопцаў можна было бачыць у клубе, у школе, у бібліятэцы, з мясцовай моладдзю, на спартыўных пляцоўках, на рыбалцы. Напэўна, да гэтага часу памятаюць мясцовыя жыхары задушэўныя беларускія песні, што гучалі са сцэн клубаў і пад адкрытым небам.

Тое цяжкае казахстанскае лета згуртавала нас, навучыла пераадольваць цяжкасці, прымусіла больш сур'ёзна паглядзець адзін на другога, даведацца, чым кожны жыве, праверыць чалавечыя якасці кожнага працай — самым адказным экзаменам.

Не выпадкова многія ветэраны будаўнічых атрадаў, заканчваючы універсітэт, гавораць, што не ўяўляюць сабе студэнцкае лета без студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

**Н. АКУЛІЧ,**
**старшы выкладчык кафедры механікі Гомельскага дзяржуніверсітэта, камандзір першага будатрада ГДУ.**

